(ознакомительный фрагмент)

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка"

УДК 947.6

Багдановіч Андрэй Іванавіч

НАВУКОВАЯ І КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ (1861-1900 гг.)

07.00.02 – Айчынная гісторыя

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

Мінск - 2003

Работа выканана ва Установе адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

Навуковы кіраўнік — доктар гістарычных навук, прафесар Люты А.М. (Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка", кафедра гісторыі Беларусі)

Афіцыйныя апаненты: — доктар гістарычных навук, прафесар Бяспалая М.А. (Беларускі універсітэт культуры, кафедра гісторыі і культуралогіі)

кандыдат гістарычных навук, дацэнт Жылінскі Г. В. (Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка,

Апаніруючая арганіза — дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы"

Абарона адбудзецца "23" мая 2003 года ў 16 гадзін на паседжанні Савета па абароне дысертацый Д 02.21.03 пры Установе адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка" па адрасу: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, аўд 482; тэл 220 – 86 – 33.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

Аўтарэферат разасланы "11" красавіка 2003 г.

Вучоны сакратар Савета
па абароне дысертацый І.І. Багдановіч

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ.

Актуальнасць тэмы дысертацыі. Пачынаючы з канца 80-х гадоў XX стагоддзя ў нашым грамадстве назіраецца крызіс і зацяжная дэпрэсія, якія канчаткова не пераадолены да гэтага часу. Крызісныя з'явы распаўсюджваюцца не толькі на эканоміку і сацыяльную сферу, але і на культуру, навуку, духоўны стан беларускага грамадства. Абавязак сучаснай інтэлігенцыі дапамагчы свайму народу пераадолець крызіс духоўнай культуры ў нашай краіне. Гэта з'яўляецца вельмі складанай, але вырашальнай задачай. У нашай гісторыі ўжо былі падобныя крызісныя перыяды, у пераадоленне якіх значны ўклад унесла інтэлігенцыя.

У парэформенны перыяд грамадства Беларусі сутыкнулася з праблемамі, якія вельмі сходныя з сучаснымі. У той час, як і зараз, ішла карэнная ломка сацыяльна-эканамічнага ўкладу, людзі павінны былі прыстасоўвацца да новых умоў гаспадарання, шукаць сродкі каб неяк забяспечыць існаванне сабе і сваей сям'і, існавала праблема алкагалізацыі насельніцтва, кніжны рынак быў забіты таннай і безгустоўнай літаратурай, людзі былі вельмі абмежаванымі ў сваім духоўным, ментальным і культурным развіцці. Яны не ўспрымалі сябе як асобны народ з уласнай гісторыяй і ўласнымі нацыянальнымі інтарэсамі, а лічылі сябе насельніцтвам паўночна-заходняга краю Расійскай імперыі.

Вывучэнне і ўзнаўленне гісторыі навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі ў Беларусі ўтрымлівае ў сабе вопыт амаль паўстагоддзя служэння людзей разумовых прафесій свайму народу. Гэты вопыт з'яўляецца павучальным для сучаснікаў, а даследаванне і вывучэнне навуковай і культурна-асветніцкай работы, на наш погляд, з'яўляецца актуальным для сучаснай гістарычнай навукі і для дзейнасці сучаснай беларускай інтэлігенцыі.

У архіўных і бібліяграфічных крыніцах утрымліваюцца шматлікія сведчанні аб тым, што ў другой палове XIX стагоддзя ў Беларусі вялася шырокая і паўнацэнная навуковая і культурна-асветніцкая работа. Усё гэта адбывалася нягледзячы на жорсткі кантроль царызму, яго ідэалагічны прэсінг, недахоп матэрыяльных сродкаў і адсутнасць ў Беларусі вышэйшых навучальных і навукова-даследчых устаноў. Інтэлігенцыя займалася вырашэннем надзённых сацыяльных і эканамічных праблем тагачаснага грамадства. Таму ў дысертацыі закранаюцца многія сацыяльныя супярэчнасці і эканамічныя з'явы, якія існавалі ў той час ў Беларусі. Сама інтэлігенцыя была не аднароднай па свайму адукацыйнаму ўзроўню, сацыяльнаму паходжанню, нацыянальнаму і прафесійнаму складу, па сваіх поглядах і роду заняткаў, аднак нягледзячы на гэта яна рабіла агульную справу – несла ў народ навуковыя веды, спрыяла росту яго адукацыйнага і культурнага ўзроўню.

У беларускай гістарыяграфіі навуковая і культурна-асветніцкая работа інтэлігенцыі закранаецца ў шматлікіх даследаваннях і публікацыях, прысвечаных развіццю культуры, адукацыі, пазашкольных устаноў, музеяў, бібліятэк, тэатраў і г. д. Аднак да гэтага часу няма ніводнага навуковага даследавання, у якім комплексна разглядалася б шматгранная і разнастайная навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі, даследаваўся б яе колькасны, прафесійны, нацыянальны склад, адукацыйны ўзровень, адносіны ўлады да яе дзейнасці.

У рабоце прааналізаваныя розныя бакі навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі і стаўленне ўрада да яе, зроблены высновы адносна кірункаў і стратэгіі гэтай дзейнасці. Матэрыялы для дадзенай дысертацыі ўяўляюць сабой каштоўную крыніцу для вывучэння гісторыі развіцця вытворчых сіл, навукі і культуры Беларусі, аднак пры лакальным разглядзе асобна ўзятых падзей навуковага і культурнага жыцця губляецца іх месца ў агульнагістарычным працэсе. Таму пры даследаванні дадзенай праблематыкі, была засяроджана ўвага на аналізе непасрэднага ўдзелу інтэлігенцыі Беларусі ў агульнарасійскім культурна-асветніцкім руху і яе непасрэдным укладзе ў справу развіцця навукі, тэхнікі, павышэнне адукацыйнага і культурнага ўзроўню народа.

Сувязь працы з буйнейшымі навуковымі праграмамі, тэмамі. Тэма дадзенага даследавання зацверджана на Вучоным савеце БДПУ імя Максіма Танка (пратакол № 5 ад 22 лютага 2000 г.). Яна ўваходзіць у склад навуковай тэмы "Сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае развіцце Беларусі ў XVIII – XIX ст.ст.", якую распрацоўвае кафедра гісторыі Беларусі БДПУ імя М. Танка і каардынуе НАН Беларусі (№ ДР 19942101).

Мэта і задачы даследавання. Мэтай дысертацыйнага даследавння з'яўляецца высвятленне ролі інтэлігенцыі ў гістарычным развіцці Беларусі, узбагачэнні яе навукі і культуры, адраджэнні нацыянальнай свядомасці.

У сувязі з гэтым былі вызначаны наступныя задачы даследавання:

* Зрабіць гістарыяграфічны аналіз даследуемай праблемы, даць агляд і характарыстыку яе крыніцазнаўчай базы, у першую чаргу, архіўных фондаў.

* Даследаваць колькасны склад інтэлігенцыі, яе нацыянальны, сацыяльны, прафесійны састаў і адукацыйны ўзровень. Прасачыць дынаміку змянення гэтых паказчыкаў на працягу даследуемага ў дысертацыі адрэзку часу і на гэтай аснове стварыць сацыяльны партрэт тагачаснай інтэлігенцыі ў Беларусі.

* Прааналізаваць палітыку дзяржавы ў адносінах да інтэлігенцыі, яе навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці і даць ацэнку ўзаемаадносін інтэлігенцыі, што займалася навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасцю, з цэнтральнымі і мясцовымі органамі дзяржаўнай улады.

* Выявіць факты існавання і дзейнасці навуковых арганізацый і таварыстваў, а таксама асобных навукоўцаў і вынаходнікаў, што жылі і працавалі на тэрыторыі Беларусі, іх ролю ў развіцці навукова-тэхнічнай думкі і распаўсюджанні вынікаў сваіх даследаванняў і вынаходніцтваў.

* Высветліць асноўныя накірункі культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі, яе змест, прынцыпы стварэння, арганізацыі і канкрэтныя факты дзейнасці культурна-асветніцкіх таварыстваў, а таксама выніковасць іх работы у галіне павышэння адукацыйнага і культурнага ўзроўню народа.

* Ацаніць эфектыўнасць навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі для станаўлення беларускай навукі і развіцця культуры.

Аб'ект і прадмет даследавання. Аб'ектам даследавання з'яўляецца навуковае і культурнае жыццё Беларусі ў парэформенны перыяд (1861 – 1900 гг.), працэсы і факты, якія характарызуюць яго стан.

Прадмет даследавання – інтэлігенцыя і яе навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць ў 1861 – 1900 гг., яе даследаванні ў галіне дакладных, прыродазнаўчых і грамадскіх навук, папулярызацыя здабытых навуковых ведаў, распаўсюджанне іх сярод насельніцтва, культурна-асветніцкая работа ў горадзе і на весцы: арганізацыя народных чытанняў, народных бібліятэк і чытальняў, тэатраў, музыкальна-драматычных гурткоў і таварыстваў, нядзельных школ і адукацыйных курсаў, кніжнага гандлю.

Храналагічныя і геаграфічныя рамкі даследавання. У рабоце разглядаюцца падзеі, асобы і факты, якія маюць адносіны да тэрыторыі Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай, Гродзенскай і Віленскай губерняў. Першыя чатыры разглядаюцца таму, што іменна яны складаюць аснову сучаснай тэрыторыі Беларусі, а апошняя ўключана таму, што горад Вільня ў разглядаемы намі перыяд з'яўляўся культурным і адміністрацыйным цэнтрам Беларусі, бо Віленская навучальная акруга ўключала ў сябе ўсю тэрыторыю сучаснай Беларусі. Таму падзеі культурнага жыцця Віленшчыны ў другой палове XIX стагоддзя нельга разглядаць асобна ад беларускіх зямель.

Храналагічныя рамкі даследавання ахопліваюць перыяд, які пачынаецца з адмены прыгоннага права ў Расійскай імперыі і заканчваецца канцом стагоддзя. Гэты перыяд быў часам вялікага пад'ёма ў сферы навукі, тэхнікі, прамысловасці, транспарту, кнігавыдання, роста грамадска-палітычнай свядомасці беларускага народа. Для інтэлігенцыі гэта быў багаты і плённы перыяд у яе навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці, які якасна адрозніваўся ад папярэдняга.

У дарэформенны час адукацыя і разумовая праца былі ў асноўным прывілеямі вышэйшых саслоўяў таму толькі найбольш прагрэсіўныя прадстаўнікі інтэлігенцыі непакоіліся аб лёсе свайго народа і імкнуліся развіваць навуку і культуру. Пасля 1861 года склад інтэлігенцыі дэмакратызуецца – інтэлектуальнай працай займаюцца ўжо шматлікія прадстаўнікі іншых саслоўяў. Усё больш і больш прадстаўнікоў інтэлігенцыі намагаецца вырашаць набалелыя грамадскія праблемы сродкамі навуковай і культурна – асветніцкай дзейнасці. Таму аўтар перакананы, што менавіта гэты перыяд існавання інтэлігенцыі Беларусі варта лічыць найбольш прадуктыўным за ўвесь дарэвалюцыйны час.

Метадалогія і метады праведзеннага даследавання. Метадалагічнай асновай дысертацыі з'яўляюцца навуковыя прынцыпы гістарызму, аб'ектыўнасці і сістэмнасці ў вывучэнні гістарычных матэрыялаў, якія заснаваныя на прыярытэце дакументальных фактаў і адмове ад палітычнай заангажаванасці.

У працэсе даследавання выкарыстоўваліся таксама агульнанавуковыя метады (аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, лагічны, узыходжанне ад канкрэтнага да абстрактнага і інш.) і спецыяльныя гістарычныя: гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны. Гэта дазволіла правесці ўсебаковы аналіз падзей і фактаў у іх храналагічнай і лагічнай паслядоўнасці, у межах сістэмы, структурныя часткі якой ахопліваюць увесь комплекс пытанняў, што адлюстроўваюць навуковую і культурна-асветніцкую дзейнасць інтэлігенцыі ў парэформенны перыяд (1861 – 1900гг.) і яе ўзаемаадносіны з уладай.

У аснову даследавання пакладзены крытычнае вывучэнне і аналіз, сінтэз і параўнанне першакрыніц, а таксама перакрыжаваная пераправерка даных. Гэта

дазволіла ўсебакова прааналізаваць разнастайныя факты шматграннай дзейнасці інтэлігенцыі Беларусі, сістэматызаваць і абагульніць іх. Пры даследаванні вынікаў навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі мы імкнуліся кіравацца каштоўнасным падыходам, каб пазбегнуць аднабаковых і суб'ектыўных ацэнак месца і ролі інтэлігенцыі ў развіцці беларускага грамадства ў даследуемы перыяд.

Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў. Дадзеная дысертацыя з'яўляецца першым у айчыннай гістарыяграфіі комплексным даследаваннем шматграннай дзейнасці інтэлігенцыі Беларусі пасля адмены прыгоннага права ў 1861 – 1900 гг.

Аналіз і абагульненне сабраных матэрыялаў дазволілі зрабіць высновы аб тым, што інтэлігенцыя сваёй навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасцю аказала значны ўплыў на эканамічнае і культурнае развіццё беларускага грамадства ў парэформенны перыяд. Упершыню дадзены гістарычны нарыс развіцця навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці ў Беларусі ў 1861 – 1900 гадах. У публікацыях аўтара дысертацыі навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі разглядаецца як частка беларускай гісторыі. Аўтар даў аналітычную характарыстыку ўзроўню развіцця навукі, культуры і адукацыі ў Беларусі. На аснове апрацаванага матэрыяла ўдалося выявіць асноўныя накірункі навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі і фактары, якія ўплывалі на стан і развіцце навукі і культурна-асветніцкай работы.

Практычная значнасць атрыманых вынікаў даследавання. Вынікі дысертацыі могуць служыць асновай для далейшага вывучэння гісторыі інтэлігенцыі Беларусі, яе навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці, для напісання навуковых прац па розных аспектах гісторыі навукі і культуры Беларусі. Іх можна выкарыстоўваць пры распрацоўцы агульных і спецыяльных курсаў па айчыннай гісторыі ў навучальных установах гістарычнага, культуралагічнага і эканамічнага профілю, а таксама для прапаганды гістарычных ведаў у сродках масавай інфармацыі.

Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.

1. У другой палове XIX стагоддзя ў Беларусі існавала адносна невялікая колькасць людзей, якія належылі да нешматлікай праслойкі інтэлігенцыі. Большасць з гэтых людзей не мелі вышэйшай і нават сярэдняй спецыяльнай адукацыі і не з'яўляліся этнічнымі беларусамі. Нацыянальны склад інтэлігенцыі істотна не супадаў з этнічным складам насельніцтва беларускіх губерняў. Этнічныя беларусы ў ім складалі менш адной чвэрці, таму яны не маглі істотна ўплываць на змест і асноўныя накірункі навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці ў сваім краі. Нягледзячы на адносна невялікую долю інтэлігенцыі ў складзе насельніцтва краю, яна аказвала значны ўплыў на павышэнне адукацыйнага і культурнага ўзроўню народа, аб'ектыўна яе дзейнасць садзейнічала станаўленню беларускай культуры і нацыянальнай свядомасці.

2. Інтэлігенцыя Беларусі вяла навукова-даследчую працу па розных аспектах тэхнічных, прыродазнаўчых і гуманітарных навук, нягледзячы на адсутнасць тут буйных навукова-даследчых цэнтраў і вышэйшых навучальных устаноў. Навуковымі даследаваннямі і тэхнічнымі вынаходніцтвамі займаліся прадстаўнікі самых розных прафесій, якія атрымлівалі каштоўныя навуковыя вынікі і рабілі цікавыя вынаходніцтвы. Вынікі сваіх даследаванняў і вынаходніцтвы яны прапагандавалі праз

навуковыя публікацыі, удзел у навуковых з'ездах і канферэнцыях, стварэнне музеяў і ўдзел ва ўсерасійскіх і сусветных выставах.

3. Царскі ўрад імкнуўся ўсталяваць кантроль за навуковай дзейнасцю інтэлігенцыі. Ён падтрымліваў матэрыяльна толькі тыя навуковыя праекты, якія былі неабходнымі для ўмацавання пазіцый самадзяржаўя на беларускіх землях, не перашкаджаў распрацоўцы палітычна нейтральных праектаў і праграм, і, адначасова, чыніў шматлікія перашкоды тым таварыствам і асобам, якія спрабавалі ажыццяўляць самастойную палітыку ў развіцці навукі і асветніцкай дзейнасці ў беларускіх губернях.

4. Царызм імкнуўся таксама ажыццяўляць дробязную апеку над культурна-асветніцкімі ўстановамі, што ствараліся перадавымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі. Гэта, безумоўна, перашкаджала весці паўнацэнную культурна-асветніцкую работу, але не магло спыніць імкненне інтэлігенцыі да развіцця навукі, распаўсюджання ў народзе навуковых ведаў, павышэння яго адукацыйнага і культурнага ўзроўню. Да таго ж царызм разумеў неабходнасць хаця б мінімальнага ўзроўню асветы народа, без якога далейшы навукова-тэхнічны і культурны прагрэс грамадства быў немагчымым.

5. Культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі ў даследуемы намі перыяд была больш шматграннай і развівалася больш паспяхова, чым навуковая. Яна праяўлялася ў самых розных формах: праз арганізацыю народных чытанняў, музеяў, народных бібліятэк і чытальняў, нядзельных школ, адукацыйных курсаў, аматарскіх і прафесійных тэатральных труп. Гэтыя віды дзейнасці былі скіраваныя на вырашэнне надзённых праблем, якія паўставалі перад тагачасным грамадствам, спрыялі павышэнню ўзроўню культуры і інфармаванасці народа.

6. Дзякуючы намаганням інтэлігенцыі ў Беларусі адбываўся пэўны ўздым цікавасці насельніцтва да павышэння свайго адукацыйнага і культурнага ўзроўню. Гэта праявілася ў актывізацыі наведавання народных чытанняў, бібліятэк, чытальняў, тэатраў і спектакляў, у набыцці кніг, навучанні ў нядзельных школах, і на адукацыйных курсах, і г. д.

Асабісты ўклад суіскальніка. Даследаванне з'яўляецца самастойнай, закончанай, творчай працай аўтара. Аўтарам вывучаны, прааналізаваны і сістэматызаваны вялікі фактычны матэрыял, выяўляны ў шматлікіх архіўных фондах, апублікаваных дакументах афіцыйных устаноў Расійскай імперыі, навуковых працах расійскіх і айчынных вучоных, зроблены новыя арыгінальныя высновы.

Апрабацыя вынікаў дысертацыі. Асобныя вынікі дысертацыйнага даследавання выкладзены на чатырох міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях і ў час удзелу аўтара ў рабоце міжнароднай школы-семінара ў лютым 2002 года, якая працавала пры Львоўскім нацыянальным універсітэце (Украіна). Дысертацыя абмяркоўвалася і атрымала станоўчыя водгукі на паседжаннях кафедры гісторыі Беларусі БДПУ імя Максіма Танка.

Апублікаванасць вынікаў. Асноўныя палажэнні, фактычны матэрыял, абагульненні і вынікі, што змешчаны ў дысертацыі знайшлі свае адлюстраванне ў 9 навуковых публікацыях: васьмі артыкулах у рэцэнзуемых навуковых зборніках і часопісах і адных тэзісах дакладаў навуковых канферэнцый. Агульны аб'ём публікацый складае 48 старонак.

Структура і аб'ём дысертацыі. Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і літаратуры (уключае 212 найменняў).Агульны аб'ём работы 113 старонак, з якіх 12 старонак займае спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры.

Асноўны змест работы

Ва ўводзінах гісторыя навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі характарызуецца як адна з фундамельных праблем беларускай гістарыяграфіі, вызначаюцца падыходы аўтара да азначэння паняцця "інтэлігенцыя", а таксама даецца характарыстыка гістарычнага фону, на якім разгортвалася дзейнасць інтэлігенцыі ў Беларусі ў парэформенны перыяд.

Агульная характарыстыка работы змяшчае абгрунтаванне актуальнасці тэмы, яе навуковай і практычнай значнасці, паказвае сувязь работы з навуковымі праграмамі, якія распрацоўваюцца ў БДПУ імя Максіма Танка і каардынуюцца Інстытутам гісторыі НАН Беларусі. Вызначаны мэты і задачы, аб'ект і прадмет даследавання, яго храналагічныя межы, метадалогія і метады, якія ўжываліся пры яго правядзянні. Характарызуецца навуковая навізна і практычная значнасць атрыманых вынікаў. Сфармуляваны асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону. Змяшчаецца інфармацыя аб асабістым ўкладзе саіскальніка ў распрацоўку названай праблемы, аб апрабацыі і апублікаванасці вынікаў дысертацыйнага даследавання, яго структуры і аб'ёме.

У першай главе "Гістарыяграфія і крыніцы" аўтар асвятляе гістарыяграфію даследуемай тэмы і яе крыніцазнаўчую базу. Навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі ў Беларусі знайшла свае адлюстраванне яшчэ ў дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі. Але дарэвалюцыйныя аўтары, як правіла, абмяжоўваліся асвятленнем фактычнага боку справы. Тыя ацэнкі і аналіз, якія рабіліся сучаснікамі падзей нярэдка былі тэндэнцыйнымі і адлюстроўвалі тагачасную палітыку і ідэалогію ў галіне пазашкольнай адукацыі і культурна-асветніцкай работы. Асабліва цікавымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца працы В. П. Вахцерава, А. С. Пругавіна і А. І. Мілавідава[1].

У беларускай і савецкай гістарыяграфіі пытанні звязаныя з навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасцю інтэлігенцыі закраналіся ў абагульняючых працах і манаграфічных выданнях прысвечаных гісторыі культуры Беларусі. У гэтых выданнях асноўная ўвага надавалася гісторыі станаўлення беларускай нацыянальнай культуры і

---

[1] Вахтеров В. П. Народные чтения // Русская школа. – 1896. - № 5 – 6. - С. 160 – 240.; Народные чтения // Русская школа. – 1896. № 9 – 10 . – С. 90 – 150.; Внешкольное образование народа. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1896. – 372 с.; Пругавин А.С. Запросы народа и обязашности интеллигенции. - СПб.: Изд. Мин-тва нар. просвещения, 1895. – XX, 547с.; Миловидов А. И. Важнейшие просветительные учреждения в Северо-Западном крае. // Журнал министерства народного просвещения. -1903.; Народные религиозно-нравственные чтения со световыми картинками в г. Вильно, их значение и возможности распространения // Литовские епархиальные ведомости. – 1897. – 7 февраля. – С. 3 – 4.

дзейнасці асобных прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі.[1] У гэтых фундаментальных даследаваннях разнастайная навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі Беларусі ў цэлым засталася па-за увагай аўтараў адпаведных раздзелаў.

Выключэннем з гэтага правіла з'яўляецца падрыхтаваная ў пачатку 80-х гадоў XX стагоддзя вучонымі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору "Гісторыя беларустага тэатра"[2]. Гэта грунтоўная гістарычная праца, у якой паказана дзейнасць тэатраў, ідэйная барацьба прафесійных і непрафесійных акцёраў, якія жылі і дзейнічалі ў Беларусі, незалежна ад іх нацыянальнай прыналежнасці.

Толькі ў канцы 80-х – пачатку 90-х гадоў XX ст. паяўляюцца першыя дысертацыйныя даследаванні, у якіх закранаюцца праблемы навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці другой паловы XIX – пачатку XX ст. Гэта кандыдацкія дысертацыі Т. А. Пархоменка, Н. Р. Бярозкінай і А. Л. Кіштымава[3]. Адначасова выходзяць з друку шэраг навуковых публікацый і артыкулаў беларускіх вучоных, у якіх закранаюцца розныя аспекты даследуемай намі праблемы. Гэта работы М. В. Біча, М. А. Бяспалай, А. А. Гужылоўскага[4], С. А. Кавалёва, Г. А. Каханоўскага. У. І. Меляшкевіча, Л. А. Савіцкай, С. С. Рудовіча, А. Г. Усцюгавай, У. І. Філякова[5].

---

[1] Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т . / Акад. Навук Беларусі. Ін-т. гісторыі. Т-2. Гал. рэдкалегія. І. М. Ігнаценка і інш. - Мінск.: Навука і тэхніка, 1972. – 632 с.; История Белорусской ССР: В 2 т. Т. 1. – Минск: Наука и техника, 1961. – 692 с.; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. У 2 т. Рэдкалегія В.В. Барысенка і інш. Т. 2.Літаратура XIX – пачатку XX ст. – Мн.: Навука і тэхніка, 1969. – 620 с.; Лыч Л. М. Навіцкі У. І. Гісторыя культуры Беларусі. – Мінск: ВП "Экаперспектыва", 1997. - 489 с.; Нарысы Гісторыі Беларусі у 2 ч. Ч. 1. / Рэдкалегія М. П. Касцюк, І. Ф. Ісаенка, Г. В. Штыхаў і інш. - Мінск.: Беларусь, 1994. – 527 с.;

[2] Гісторыя беларускага тэатра. У 3 т. Рэдкалегія Г.І. Барышаў і інш. Т. 1. Беларускі тэатр ад вытокаў да Кастрычніка 1917.– Мн.: Навука і тэхніка, 1983. – 496 с.

[3] Пархоменко А. Культурно-просветительская деятельность в России (конец XIX в. - 1917 г.). Дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02/ Моск. гос. пед. ин-т . – М. 1988. – 235.; Березкина Н. Г. Пропаганда естественных и технических знаний в печати Белоруссии (1861-1917 гг.): Дис. ... канд. ист. наук. 07.00.02. - Минск, 1990. – 172 с.; Киштымов А.Л. Беларусь на выставках XIX начала XX в.: Дис. канд. ... истор. наук.: 07.00.02. – Минск, 2001. – 205 с.

[4] Біч М.В. Беларускае адраджэнне ў XIX - пач. XX ст.: гістарычныя асаблівасці ўзаемаадносін з іншымі народамі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 29 с.; Бяспалая М. З гісторыі народнай асветы // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1987. – № 2. – С. 32-33.; Гужылоўскі А. З гісторыі музейнай справы на Беларусі // Беларускія музеі. Гісторыя, хроніка, сучаснасць . – Мінск: БДУ, 1998. - С.15 – 57.

[5] Кавалёў С. А. Асвета ў жыцці беларусаў // Народная асвета. - 1995. - № 11. - С. 136-139.; Кохановский Г. Редкости для всеобщего употребления // Неман. - 1979. - № 7. – С. 154 – 167.; Мелешкевич В.И. Русско – белорусские культурные связи во второй половине XIX века: Автореф. дисс. ... канд. истор. наук: 07.00.02. / Ин-т. истории АН БССР. – Минск. 1979. – 22 с.; Савицкая Л.А. О культурно - просветительской работе Северо-Западного отдела РГО // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Вып. 6. - Минск: БГУ, 1987. – С.119 – 127.; Рудович С. Час выбару: праблема самвызначэння Беларусі ў 1917 годзе. – Мінск: Тэхналогія, 2001. – 201 с.; Устюгова А. Г, Проблемы белорусской дореволюционнонной интеллигенции в исследованиях белорусских и российских историков // Шлях у

распаўсюджання навуковых ведаў аб'ектыўна спрыялі павышэнню адукацыйнага і культурнага ўзроўню народа, фарміраванню культурнага асяроддзя, ў якім узніклі перадумовы для станаўлення беларускай навукі, літаратуры, тэатра і культуры, узнікненню і станаўленню нацыянальнай самасвядомасці [2, 4, 6, 8].

Спіс публікацый па тэме дысертацыі

1. Багдановіч А.І. Колькасны і якасны склад інтэлігенцыі Беларусі ў другой палове XIX стагоддзя // Айчынная і сусветная гісторыя сучасныя погляды і метады даследаванняў. У 2 ч. Ч. 1: Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі. – Мн.: БДПУ імя М. Танка, 2000. - С. 56 – 63.

2. Багдановіч А.І. Народныя чытанні ў культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі Беларусі ў другой палове XIX ст. // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследавання. У 2 ч. Ч. 1: Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі. – Мн.: БДПУ імя М. Танка, 2002. – С. 99 – 108.

3. Багдановіч А.І. Гістарыяграфія і крыніцы па праблеме навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі Беларусі ў другой палове XIX ст. // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследавання. У 2 ч. Ч. 1: Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі. – Мн.: БДПУ імя М. Танка, 2002. - С. 108 – 114.

4. Багдановіч А.І. Навукова - тэхнічная дзейнасць інтэлігенцыі Беларусі ў 60-х гг. XIX – пачатку XX ст. // Актуальныя пытанні сучаснай навукі: Зб. навук. прац: у 2 ч. – Мн.: БДПУ, 2002. Ч. 1. - С. 5 – 8.

5. Багдановіч А.І. Стаўленне дзяржавы да навуковай дзейнасці інтэлігенцыі Беларусі ў другой палове XIX ст. // Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні: Матэрыялы рэсп. навук. практ. канф., Мінск, 25 кастрычніка 2002 г.; Рэдкал.: У.В. Тугай і інш. – Мн.: БДПУ, 2002. - С. 195 – 198.

6. Багдановіч Андрэй. Асноўныя напрамкі культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі Беларусі ў другой палове XIX ст. // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2002. – № 4. - С. 114 – 118.

7. Багдановіч А.І. Тэатр і музычна-драматычныя гурткі ў культурна-асветніцкай дзейнасці ў Беларусі ў 60-я гады XIX пач. XX ст. // Весці БДПУ. - 2003. - №1. - С. 224 – 229.

8. Багдановіч А.І. Асноўныя накірункі культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі Беларусі ў другой палове XIX ст. // Народныя традыцыі і нацыянальная культура: Матэрыялы рэсп. навук. практ. канф. Мінск, 6 – 7 снеж. 2001 г.: У двух кн. / Пад. рэд. В.С. Цітова. – Мінск: БДПУ, 2003. – Кн. 2. - С. 40 – 4 3.

9 . Багдановіч А.І. Дзяржаўная палітыка ў адносінах да дзейнасці інтэлігенцыі Беларусі ў другой палове XIX ст. // Наука – образованию, производству, экономике. Рефераты докладов международной науч.-техн. конференции. В 2-х томах. Т 2. / Под редакцией Б. М. Хрусталёва. – Минск: Технопринт, 2003. - С. 157.

Рэзюмэ

Багдановіч Андрэй Іванавіч

Навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі ў Беларусі (1861 – 1900 гг.)

Ключавыя словы: інтэлігенцыя, беларускія губерні, навуковая дзейнасць, культурна-асветніцкая дзейнасць, палітыка ўрада, народныя чытанні, бібліятэкі, чытальні, тэатр, кніжны гандаль, нядзельныя школы, адукацыйныя курсы.

Абъект даследавання – навуковае і культурнае жыццё Беларусі ў парэформенны перыяд (1861 – 1900), працэсы і факты, якія характарызуюць яго стан. **Прадмет даследавання** – непасрэдна сама інтэлігенцыя, яе навуковыя даследаванні ў галіне прыродазнаўчых і гуманітарных навук, культурна – асветніцкая дзейнасць у горадзе і ў вёсцы: арганізацыя народных чытанняў, народных бібліятэк і чытальняў, тэатраў, музычна-драматычных таварыстваў і гурткоў, нядзельных школ і адукацыйных курсаў.

Мэта даследавання – высвятленне ролі інтэлігенцыі ў гістарычным развіцці Беларусі, узбагачэнні яе навукі і культуры, адраджэні нацыянальнай свядомасці.

Навуковая навізна атрыманых вынікаў заключаецца ў комплексным даследаванні навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі ў 1861 – 1900 гг., якое праведзена ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі. Дадзены гістарычны нарыс развіцця навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі, аналізуецца ўрадавая палітыка да яе, а таксама даецца больш высокая, ў параўнанні з папярэдняй беларускай гістарыяграфіяй, ацэнка ўзроўню развіцця навукі, культуры і адукацыі. На аснове аналіза шырокага кола гістарычных крыніц вызначаны асноўныя накірункі навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі і фактары, якія ўплывалі на яе стан.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны як аснова для далейшага вывучэння гісторыі дзейнасці інтэлігенцыі, напісання навуковых прац па розных аспектах гісторыі, навукі і культуры Беларусі, а таксама пры распрацоўцы спецкурсаў і спецсемінараў у навучальных установах гістарычнага, культуралагічнага і эканамічнага профілю і прапаганды гістарычных ведаў у сродках масавай інфармацыі.

Резюме

Богданович Андрей Иванович

Научная и культурно-просветительская деятельность интеллигенции в Беларуси (1861 – 1900 г.г.)

Ключевые слова: интеллигенция, белорусские губернии, научная деятельность, культурно-просветительская деятельность, политика правительства, народные чтения, библиотеки, читальни, театр, книжная торговля, воскресные школы, образовательные курсы.

Объект исследования – научная и культурная жизнь Беларуси в пореформенный период (1861 – 1900 гг.), процессы и факты, которые характеризуют её состояние. **Предмет исследования** – непосредственно сама интеллигенция, её научные исследования в области естественных и гуманитарных наук, культурно-просветительская деятельность в городе и в деревне: организация народных чтений, народных библиотек и читален, театров, музыкально-драматических обществ и кружков, воскресных школ, образовательных курсов.

Цель исследования – выявление роли интеллигенции в историческом развитии Беларуси, обогащении её науки и культуры, возрождении национального сознания.

Научная новизна полученных результатов заключается в комплексном исследовании научной и культурно-просветительской деятельности интеллигенции в 1861 – 1900гг., проведенном впервые в белорусской историографии. Дан исторический очерк развития научной и культурно-просветительской деятельности интеллигенции, анализируется правительственная политика в отношении неё, а также даётся более высокая в сравнении с прежней белоруской историографией оценка уровня науки культуры и образования. На основе анализа широкого круга исторических источников определены основные направления научной и культурно-просветительской деятельности интеллигенции и факторы, которые влияют на её состояние.

Результаты исследования могут быть использованы как основа для дальнейшего изучения истории деятельности интеллигенции, написания научных трудов по различным аспектам истории науки и культуры Беларуси, а так же при разработке спецкурсов и спецсеминаров в учебных заведениях исторического, культурологического и экономического профиля и пропаганды исторических знаний в средствах массовой информации.

SUMMARY

Bahdanovich Andrei Ivanovich.

The scientific and enlightenmental activity of the intelligentsia in Belarus (1861 – 1900)

The key words: intelligentsia, Belarusian provinces, scientific activity, enlightenmental activity, governmental policy, popular readings and libraries, reading-rooms, theatres, book merchantry, Sunday schools, educational courses.

The object of research – scientific and cultural life of Belarus during The After-Reform period (1861 – 1900), process and facts that are characterize its condition.

The subject of research – is intelligentsia itself, its scientific research work in spheres of natural and human sciences, enlightenmental activity in cities and villages, organization of popular readings, popular libraries and reading-rooms, theatres, musical and drama circles, Sunday schools, educational courses.

The aim of research is identification of the role of intelligentsia in historical development of Belarus, enrichment of its science, culture and revival of national feeling

The novelty of research results: Complex research of scientific, cultural and enlightenmental activity of the intelligentsia in 1861 – 1900 is carried out in Belarusian historiography for the first time. In the dissertation work historical sketch of development of scientific and enlightenmental activity is given; also the governmental policy in respect to this activity is analyzed here. In the dissertation a higher evaluation to a level of development of science culture and education in comparison with former Byelorussian historiography is made. On the basis of the analysis of a wide circle of historical sources the basic directions of scientific cultural and enlightenmental activity of intelligentsia are outlined and the factors which influence on its status are defined in the work.

The results of research can be used as a basis for the further study of the history of intelligentsia's activity, for writing research works in various aspects of a history science and culture of Belarus, and for development of special courses and seminars in educational institutions of historical, culturological and economic structure. The work can be used for propagation of historical knowledge in mass media.